Ответить на этот сакраментальный вопрос русской истории у нас проще. Чернобыль – наша данность, и надо выстраивать стратегию выживания нации, исходя из факта трагедии, случившейся 15 лет назад. Чернобыль ставит нас перед важной дилеммой: одни мы со своей бедой не справимся, поэтому либо мы постепенно вымираем, либо находим верную стратегию и союзников, способных нам помочь. Как это ни грустно, но надеяться на братьев по несчастью – Россию и Украину – не стоит, у них своих проблем хватает. Остается только Запад. Он единственный обладает необходимыми финансовыми ресурсами, передовыми технологиями, развитой медициной. Все это можно получить при правильном поведении с западными странами (тем более, что ничего ужасного они от нас не требуют), прекратив строить из себя последний оплот коммунизма в мире, этакого *enfant terrible* европейской семьи народов.

Александр Зайцев в своей статье *«Чернобыль и постиндустриальная экономика»* на сайте «Геополитика» заметил: *«Беларусь в той или иной форме оказалась вклинена в контекст экономической политики Европейского союза. И в значительной мере Чернобыль присутствует здесь как один из наиболее значимых факторов»*. Дело в том, что после нефтяного кризиса 70-х Запад всерьез задумался о том, как снизить свою зависимость от мировой конъюнктуры цен на топливные энергоресурсы. Тогда выход был найден в развитии атомной энергетики, куда были инвестированы грандиозные средства. К середине 80-х во Франции и Германии АЭС давали до 70 процентов всей вырабатываемой в этих странах энергии (в СССР около 30 процентов).

После аварии на ЧАЭС, когда радиоактивные облака с Украины долетали до Финляндии, европейцы всерьез пересмотрели свою политику в области атомной энергии, прекратив строительство новых АЭС. Чернобыль существенно повлиял на корректировку и всей экономической стратегии Европейского союза, инициировав серьезные топливные проекты. Основные из них ориентированы на поставки нефти и газа из России и некоторых стран СНГ (Туркменистан, Азербайджан). Причем по мере вывода из эксплуатации старых европейских АЭС (срок эксплуатации реакторов 20-30 лет) интерес к российским поставкам энергоресурсов будет только усиливаться. Для Беларуси это означает, что значительная часть трубопроводов пройдет по ее территории и принесет огромные средства за транзит. Будем ли мы достаточно умны, чтобы не потратить их на строительство новых ледовых дворцов? ■

БЯСЬПЕКА

ВОРАГ НЯ ПРОЙДЗЕ

ТАЦЬЦЯНА ПАПОВА

Нядаўна на лекцыю па прафэсыйнай этыцы да студэнтаў-журфакаўцаў запрасілі Аляксандра Зімоўскага. Самы ангажаваны тэлевядучы заявіў будучым калегам, што свабода слова магчымая толькі ў доме для зваp'яцелых, а ў нармальных дзяржавах такія зьявы не назіраюцца.

Зімоўскі быў шчыры з моладзю. Ён пагадзіўся з абвінавачваньнямі роднага каналу ў недэмакратычнасьці, але настойваў на аб'ектыўнасьці АТНаўскіх журналістаў. Асаблівa вызначаючая сумленнасьцю сюжэты, што страляюць па верагодных лукашэнкавых супернікаў, нібы пушкі па верабях, і матар'ялы, дзе несамавіты народ нахвальвае першага прэзыдэнта РБ. Апошнія, па словах Зімоўскага, увасабленьне таленавітасьці сацыёлягаў. Іх праца на БТ складаецца з таго, каб ставіць пытаньні такім чынам, каб 9 зь 10-х адказаў адпавядалі чаканьням чалавека зь мікрафонам.

Начальнік, на якога працуе ўвесь творчы калектыў АТН, аднак, у адной з сваіх апошніх прамоў выказаў незадаволенасьць якасьцю працы кішэннага журналісцкага корпусу. *«Тут не хапае прафэсыяналізму, людзей з добрым мастацкім густам, палітычным чуцьцём. Беларускае тэлебачаньне даволі рэдка паказвае нашыя дасягненьні нават у добрых па задумцы перадачах»*.

Рэйтынг у БТ сапраўды не Божа ж мой, а выбары ўжо на носе. Каб залезьці ў душу аматараў расейскага тэлебачаньня (у Беларусі іх пераважная большасьць) Лукашэнка актывізаваў свае інтэгратарскія памкненьні і зачасьціў у РФ.

Весьці перадвыбарную гульню значна лягчэй знаходзячыся пры ўладзе. Гэта паказаў і досьвед суседняе Расіі. Усе свае папуліцкія дзеяньні можна маскіраваць пад палітычныя посьпехі і выкананьне непасрэдных прэзыдэнцкіх абавязкаў, хваляваньні аб народным дабрабыце.

У нашай краіне для зьмяненьня заканадаўства дастаткова пакорлівае каманды капірайтэраў і лукашэнкавага жаданьня падпісваць яе творчасьць. Таму рэгуляваць разьвіцьцё падзей і маніпуляваць меркаваньнем насельнікаў не так ужо й складана. Некалькі тыдняў таму вытворцы радаваліся вызваленым ад дзяржаўнага абмежаваньня коштам. Эканамісты ад улады пераканалі ў неабходнасьці такога кроку Лукашэнку, патлумачыўшы яму пазыцыю МВФ адносна пэрспэктыў крэдытаваньня Беларусі. У бізнэсоўцаў зьявілася кволая надзея на магчымасьць першых крокаў у кірунку сапраўднага рынку.

Праз колькі дзён Лукашэнку падумалася, што адпушчаныя на волю кошты з высокім інфляцыйным патэнцыялам кепска адаб'юцца на ягоным іміджы клапатліўцы аб народных кішэнях. Мінэканомікі атрымала заяву, што прэзыдэнт гатовы (пры пільнай неабходнасьці) падпісаць неўзабаве дэкрэт, забараніўшы такім чынам рост коштаў больш чым на паўадсотка ў месяц. У выпадку невыкананьня загаду кіраўніцтва паабяцалі пазбавіць пасадаў.

Агітацыйны складнік лукашэнкавай мітусьні не адзіны. Беларускаму лідэру нельга забывацца на арганізацыйны аспэкт свайго самапрызначэньня на другі з паловай прэзыдэнцкі тэрмін. Нэрвы на тлумачэньне стратэгічных задач чыноўніцтву марнуецца агромістая колькасьць. Затое вынікі абяцаюць спакой на бліжэйшыя пяць-сем год.

Імкненьнем выслужыцца перад шэфам адзначаюцца апошнім часам беларускія сілавікі. У часе сэмінару, прысьвечанага абмеркаваньню правоў і свабод насельніцтва ў кантэксьце беларускага заканадаўства, Леаніда Ерына папрасілі пракамэнтаваць нядаўнюю заяву Лукашэнкі наконт знаходжаньня на тэрыторыі Белрусі 14-х тысяч *«натрэніраваных баевікоў»*. Змагацца з арміяй малойчыкаў старшыня КДБ лічыць немэтазгодным. Аднак імёны тых, хто рыхтуе ўтранага ворага дзяржавы на сэмінарах, яму вядомыя. Ерын паабяцаў, што праз два-тры месяцы ў часе апэрацыі, накіраванай на іх высяленьне за межы Беларусі, прозьвішчы гэтых людзей станучца вядомымі і шырокай грамадзкасьці.

Баевікамі, як высьветлілася, цяпер ва ўладзе прынята называць удзельнікаў сэмінараў, якія старанна разьбіраюцца ў мудрагелістасьці беларускага заканадаўства. Пасьпяхова адолеўшы курс «выбарчы кодэкс», яны плянуюць дапамагаць дзяржаве ў выкананьні лукашэнкавага абяцаньня адкрытых і дэмакратычных выбараў. Арганізатары заняткаў неадназова запрашалі за парты прадстаўнікоў выбарчых камісыяў. Гэта, фактычна, прапанова бясплатнагаператварэньня выхавацелькі зь дзіцячага садку ў спэцыяліста па выбарчай працэдуры. Цэнтарвыбаркам адмовіўся ад такіх паслуг.

Акрамя *«баевікоў»* навідавоку, пагрозай спакою ў дзяржаве напярэдадні народнага волевыяўленьня апынуліся замежныя шпіёны. Тры чалавекі, аб якіх неяк абмовіўся Лукашэнка, і дэпартаваны чэх Міхал Плавец сталі толькі вяршыняй айсьбергу. Новыя справаздачы КДБ трапляюць на лукашэнкавы вочы штотыдня. Беларускае кіраўніцтва, па словах Ерына, проста ня хоча абвастраць і без таго напружаныя адносіны між Эўропай і нашай краінай. Кампрамату ж у нетрах камітэту дзяржбясьпекі дастаткова.

Вельмі прыемна КДБшнікам было пачуць словы падзякі ў выступленьні Лукашэнкі перад Палатай прадстаўнікоў. Леанід Ерын даў *«Рады старацца!»* і пахваліўся тым, што яго ўстанова перайшла ў разрад самаакупляльных. За час, што Ерын узначальвае КДБ, службоўцы напалявалі на 108 узораў унікальных тэхналёгіяў. Гаворка ідзе аб прамысловым шпіянажы, прыбытковасьць якога ацэньваецца ў 26 мільёнаў *USD*.

У выпадку перамогі Лукашэнкі, Ерын, найхутчэй, яшчэ доўга будзе радаваць патрона сьвежанькімі навінамі. Патрэба мець над сабою начальства ў яго ў крыві. Старшыня КДБ не супраць стварэньня грамадзкае структуры, якая б кантралявала дзейнасьць ягонае арганізацыі. ■

ДЭКРЭТ №8

Ласкава просім

ТАЦЬЦЯНА ПАПОВА

12 сакавіка Лукашэнка наважыўся такі ўзяць пад кантроль усе замежныя грошы, што беларуская грамадзкасьць дагэтуль атрымлівала на дармавых умовах. Праект дэкрэту №8 даўно варушыўся ў ягонай галаве.

На азнаямленьне з новымі парадкамі ўсім зацікаўленым далі роўна месяц. За гэты час першапачатковая абуранасьць народу перайшла ў роздум, як бы знайсьці дзірку ў новым законе. Шчылінкі ў выніку былі знойдзеныя, але іх колькасьць ня можа быць параўнанай зь лікам супярэчнасьцяў існуючаму беларускаму заканадаўству. Тыя, каму даручылі ўвасобіць прэзыдэнцкую задуму ў тэксьце, вельмі сьпяшаліся дагадзіць патрону і час ад часу гублялі пільнасьць.

Спачатку капірайтэры былі вельмі ўважлівыя. Замежную дапамогу яны вызначылі як грошы й тавары, што бязвыплатна перадаюцца беларускім фізычным ды юрыдычным асобам замежнымі дзяржавамі, міжнароднымі арганізацыямі, замежнымі арганізацыямі й грамадзянамі. Не забыліся таксама на асобаў без грамадзянства й ананімных ахвяравальнікаў.

Так былі ўзятыя пад кантроль крыніцы паступленьня варожых сродкаў. Усе атрыманыя ад іх падарункі цяпер трэба рэгістраваць у дзяржаўным камітэце па гуманітарнай дзейнасьці пры (каго яшчэ такая інфармацыя можа зацікавіць?) прэзыдэнце РБ.

Цяпер аб усіх ахвяраваньнях спачуваючых беларускім насельнікам і іх жыцьцю ў невыносных эканамічных умовах трэба рапартаваць кіраўніку дзяржавы. Ён жа, вуснамі чыноўніцтва свайго дэпартамэнту, вызначыць максымальную вагу пасылак ды памер грашовых пераводаў, зь якімі ў дэпартамэнт бегчы не абавязкова. Намесьніца старшыні дэпартамэнту Ія Малкіна супакоіла тых, каго замежнікі адорваюць 2-3-ма далярамі.

Больш значнымі грашыма й рэчамі дазволяць карыстацца толькі пры наяўнасьці дакумэнту, які пацьвярджае, што прэзыдэнту аб дапамозе ўжо паведамілі й ён даў сваю ласкавую згоду на трату бязвыплатных сродкаў. Зь сярэдзіны красавіка ін'екцыя незадэкляраванага замежнага інсуліну дыябетыку стала парушэньнем заканадаўства.

У дэкрэце месьціцца сьпіс напрамкаў, на якіх дазваляюць траціць дарункі замежнікаў. Ён выйшаў ня проста кароткім, а абгрызеным па прынцыпе: *«Не зьем, дык пакусаю»*. Адначасова дэкрэт забараняе правядзеньне сэмінараў, аплачаных замежжам. На іх, па меркаваньні ўлад, распаўсюджваецца апазыцыйная ерась. Жорстка будуць караць і за спробы надрукаваць ці распаўсюдзіць агітацыйныя матар'ялы. Барані Божа, каб, нават узгадніўшы атрыманьне грошай з дэпартамэнтам, змарнаваць іх на падрыхтоўку й правядзеньне выбараў, рэфэрэндуму, адазваць дэпутата ці чальца Рэспубліканскае рады. Не пашчасьціць таму, каго схопяць за руку ў часе арганізацыі на замежныя сродкі мітынгу, вулічнага шэсьця, дэманстрацыі, пікетаваньня ці страйку.

Стваральнікі й падпісант дэкрэту могуць цяпер паціраць далоні, маўляў, нэйтралізавалі апазыцыю. Але дакумэнт датычыць не толькі НДА й палітычных партыяў, але й бізнэс-структураў. Замежныя й сумесныя прадпрыемствы сур'ёзна задумаліся, ці варта працягваць сваю дзейнасьць у Беларусі.

Да апошняга часу практыка бязвыплатнае перадачы сродкаў ды матар'ялаў ад замежных кампаній мясцовым прадстаўніцтвам была справай звычайнай. Абсталяваньне, якога ня зробіш у Беларусі, рэклямныя матар'ялы, грошы на разьвіцьцё новых прадстаўніцтваў накіроўваліся беларускім фізычным ды юрыдычным асобам на бязвыплатнай аснове. Іншая справа, што празь некаторы час усе каштоўнасьці вярталіся да гаспадароў зь лішкам. Цяпер, каб абысьці дэкрэт, трэба заміж дамоў пазык заключаць дамовы аб крэдытаваньні, афармляць усе пастаўкі абсталяваньня на часовае карыстаньне як лізынгавыя апэрацыі.

На мінулым тыдні МЗС паспрабавала абараніць нядаўны твор прэзыдэнцкіх пісараў ад справядлівае крытыкі. Тамтэйшы прэссакратар Павал Латушка заявіў, што дакумэнт адлюстроўвае перадусім *«інтарэсы замежных арганізацый і грамадзян, якія прадстаўляюць дапамогу»* і ўводзіцца *«для прадухіленьня магчымага крадзяжу, злоўжываньня і іншых парушэньняў з боку атрымальнікаў такой дапамогі ў РБ»*. ■

ПАЛІТЫЧНЫ ПАРТРЭТ

ШКЛОЎСКІЯ СТРАСЦІ

ВОЛЬГА ПАЎЛАВА

Працяг. Пачатак у №№ 7–14

ПРЭЗІДЭНТ І РЫЖКАВІЧЫ

Падчас прэзідэнцкіх выбараў Аляксандр Лукашэнка, здаецца, дняваў і начаваў у Канаплёвых (мяркуючы па ягонай машыне, што стаяла там). У Шклове ён удзельнічаў і ў галасаванні. Напэўна, трымаў руку на пульсе інфармацыі, таму што літаральна на наступны дзень увесь Дом саветаў толькі і гаварыў пра перамогу свайго земляка.

Памятаю, як Аляксандр Рыгоравіч выязджаў з Рыжкавічаў прэзідэнтам. Я якраз ішла на абед, калі пачула сковыт міліцэйскіх машын. Падняла галаву: з завулка, дзе жыў Лукашэнка, больш сігналіў, чым выязджаў, натоўп машын. Першай павольна рухалася міліцэйская легкавушка, другой, асабістай, кіраваў Уладзімір Канаплёў. Побач з ім сядзеў Аляксандр Лукашэнка ў знаёмым сінім спартыўным касцюме, ззаду – сыны Віця і Дзіма. Замыкала эскорт былая райкамаўская «Волга» з нумарам, здаецца, 00-69 МГП, у якой быў адзін вадзіцель.

Я стаяла і пільна ўзіралася ў «канаплёўскую» машыну. Адна на вуліцы. Аляксандр Рыгоравіч мяне не мог не бачыць: сядзеў, высока і прама гледзячы перад сабой. Але не павітаўся са мной. Ну і што з таго, што я апазіцыянерка? У першую чаргу я ж ягоная суседка...

Я распавяла пасля абеду ў рэдакцыі пра ад'езд Лукашэнкі, спытала недаўменна:

– А чаму ён дзяцей з сабой возіць? На што мне адказалі:

– Ён цяпер прэзідэнт, баіцца, каб іх не выкралі. Хоча іх схаваць.

– Дык Галіна Радзівонаўна ж засталася і не баіцца.

– Пра яе ў яго галава не баліць. А я падумала – можа, наўмысна яе пакінуў?

Раздаючы членам свайго перадвыбарнага штаба пасады, Аляксандр Рыгоравіч праз шклоўскіх прыхільнікаў і памагатых пачаў актыўна папраўляць рыжкаўскую хату, якая дагэтуль абдзімалася ўсімі вятрамі. На працу сюды панагналі вялікую колькасць людзей. Работы хапала ўсім: хто саджаў запозненыя кветкі на толькі што ўскапаныя газоны, хто хату чысціў, хто траву касіў, хто цяпліцу ўзводзіў. А яшчэ больш работы навалілася на будаўнікоў: яны спешна ўзводзілі сауну, каб паспець да прыезду прэзідэнта, бо надта любіць той лазенку. Падоўжылі адрыну, ад чаго яна пазбавілася былой куртатасці. Плот таксама шмат шклоўскіх сродкаў праглынуў. Шырокі, высокі, цагляны. Ім, спецыялісты казалі, можна было б абнесці аж шэсць дамоў (суседні, Грышкі Пісарэнкі, дом таксама абклалі задарма, таму што ён надта блізка стаяў і псаваў пафарбаванай драўнінай імідж прэзідэнцкай хаты). Тыдні два не выязджалі нават за межы агарода трактары, машыны, пад'ёмныя краны...

З чаго б так падрабязнічаю, спытаецеся? Буду шчырай: сапраўды, маю намер успомніць адзін з даўно мінулых эпізодаў, які найбольш характарызуе Лукашэнку. Тады яшчэ па Беларусі блукаў непалоханы прывід дэмакратыі. А гэта значыць, што сродкі масавай інфармацыі грашылі не стопрацэнтнай хлуснёй, ахова прэзідэнта выконвала свае прамыя абавязкі, а не ізалявала яго ад людзей, і тыя маглі часам задаць хвалюючае пытанне, а не адрэдагаванае, як цяпер. Я тут згадваю час, калі прэзідэнцтва ў Беларусі адлічвала свае першыя месяцы. Тады людзі задавалі шмат пытанняў Аляксандру Рыгоравічу. Былі сярод іх і так званыя «не ў брыво, а ў вока». Напрыклад, такое вось:

– Чаму гэта вы, Аляксандр Рыгоравіч, такі вялікі цагляны плот вакол хаты ў Рыжкавічах будуеце?

Тады да мантажу гутарак прэзідэнта яшчэ не дадумаліся, і яны тыражаваліся «ўжывую». Таму праскочыў і адказ прэзідэнта (я па радыё яго пачула). Аляксандр Рыгоравіч так шчыра здзівіўся, што я, калі б не бачыла яго на ўласныя вочы каля тых рыжкавіцкіх рыштаванняў, абавязкова паверыла б у ягоную шчырасць.

– Не можа быць! Упершыню пра гэта чую. Калі гэта сапраўды так, неадкладна дам загад спыніць усе работы.

Кожны дзень, а то і па некалькі разоў на дні, праходзіла я каля хаты Лукашэнкі. А пасля яго заявы стала яшчэ больш уважлівай. Сапраўды, загад быў адразу дадзены і пачуты кім трэба. Гэта адчувалася па яшчэ большым ажыўленні вакол хаты: збудаванні вакол яе пачалі расці яшчэ шпарчэй. А працаўнікоў у мэтах эканоміі часу, каб не вазіць дамоў, часова пасялілі ў былым памяшканні канторы калгаса імя Леніна – на адной вуліцы з прэзідэнцкай хатай.

У першы прэзідэнцкі час Аляксандр Рыгоравіч вельмі любіў наведвацца на Шклоўшчыну. Часцяком, нават не зазірнуўшы ў свой рыжкавіцкі дом, імчаў да матулі ў вёску Аляксандрыя. Ну, а калі ўжо заязджаў у Рыжкавічы, то з-за міліцыі было не прабіцца: службоўцы стаялі нават паўз новы плот – ледзь не праз метр адзін ад аднаго. І на двары іх хапала. І на розных прылеглых вулачках-закавулачках. Не ведаю, якія пачуцці зведвалі іншыя сяльчане. А я, праходзячы міма, адчувала сябе ў той момант у поўнай бяспецы і міжволі напявала пад нос: «*Моя милиция меня бережёт...*» Няправільна спявала, праўда? Трэба было так: «*Моя милиция Его бережёт*».

Надта любіў наведацца ў родную вёску ледзь не ў кожны выхадны і сын прэзідэнта Віця. Ды не адзін, за ім імчаліся на адной, а то і на дзвюх машынах ягоныя целаахоўнікі. Я тады недаўмявала: ну няўжо Аляксандр Рыгоравіч не ведае, што столькі бензіну спальваецца Віцем і для Віці! І ўсё з-за аднаго дня, каб наведацца ў вёску з далёкага Мінска. Калі не ведаў Лукашэнка, дык мог без асаблівых цяжкасцей даведацца, што якраз у той час Шклоўшчына, як ніколі датуль, зведвала моцны бензінавы голад: ледзь не заміралі ў гаражы «хуткія дапамогі», толькі па самых касавых маршрутах выязджалі аўтобусы, ледзь не з усімі вёскамі райцэнтр прыпыніў якія б то ні было зносіны... Паказальным у гэтым плане быў саўгас «Гарадзец». Ён да такой ступені выбраў свой бензінавы ліміт, што не меў магчымасці вывезці з фермаў на маслазавод надоенае малако. Яго скормлівалі нават бадзяжным сабакам, залівалі ўсе свабодныя ёмістасці, і ўсё роўна значную колькасць не было куды падзець, таму вылівалі проста на зямлю. Старажылы дзяліліся ўражаннямі, што дагэтуль ніколі ў жыцці яны не бачылі малочных рэчак.

Калі такое было ў прэзідэнцкім саўгасе, дык у звычайных, напэўна, і таго горш. Толькі такія падрабязнасці былі строга засакрэчаныя. І калі б не сябры ды знаёмыя, нізавошта б і мне не даведацца пра гэтыя факты.

Калі аднойчы ў рэдакцыі гэта абмяркоўвалі, я вызвалася правесці журналісцкае расследаванне ў саўгасе «Гарадзец». Мой рэдактар узмаліўся:

– Да пенсіі хоць дацягнуць дай. Тады пішы, што хочаш.

Заканчэнне ў наступным нумары.

СКАНДАЛ

Ответных мер пока не будет

Окончание. Начало на стр. 1

Можно сравнить. В Беларусь в 2000-м году приехали 66 тысяч туристов. Чехию посетило в 100 раз больше иностранцев. Напомним, что Чехия имеет втрое меньшую территорию и одинаковое с Беларусью количество населения. Дело не в том, что мы говорим, что для нас хорошо. Это сами туристы решают. Инвестиций к нам приходит тоже в сто раз больше, чем в Беларусь.

– Опишите, пожалуйста, перспективы экономического сотрудничества Чехии и Беларуси.

– Все предыдущие договоренности сохраняются. Как в этом году будут обстоять дела с поставками сельхозпродукции – это под вопросом. Мы пока не знаем, какие будут урожаи у нас и здесь, какие будут потребности, какие будут финансовые возможности белорусов. Если посмотреть на бюджет...

– Осенью увидим?

– Да.

– Осенью, как известно, мы будем собирать и урожай политический. Расскажите, пожалуйста, о планах Чехии относительно прибытия в Беларусь наблюдателей за ходом президентских выборов.

– Сейчас еще не определен срок выборов. Поэтому нельзя на эту тему вообще говорить.

– Как вы полагаете, возможен ли вариант недопуска европейских наблюдателей на белорусские выборы президента?

– Теоретически все возможно. Как будет на практике, будет решаться в рамках ОБСЕ. Чехия не может принимать такие решения отдельно от ОБСЕ. Насчет выборов я бы хотел подчеркнуть очень существенный момент. Наблюдатели нужны для того, чтобы убедиться в том, что народ легитимным путем избирает того, кого избирает. Нас абсолютно не волнует, кто это будет. Нам важно знать, что так решил народ на основе открытой информации, что большинство проголосовало вот за этого человека. И потом, естественно, можно признавать человека, всенародно избранного. Если выборы соответствуют стандартам, если они прозрачные и проходят по европейским стандартам, никаких проблем. ■

РАЗВАЖАННІ

Здзічэласць і агрэсіўнасць

Менавіта да такога стану даведзена сучасным рэжымам наша грамадства

АНЯ ПІЛАТОВІЧ

ЯК МЫ ХАРЧУЕМСЯ

Кажуць, што чалавек ёсць тое, чым ён харчуецца. У Францыі, напрыклад, кожны школьнік вывучае прадмет, у якім расказваецца пра культуру харчавання. І дзеці там ужо змалку ведаюць, што з чым сумяшчаецца, з чым і як падаецца мяса ці рыба, як упрыгожваецца стол, якім павінен быць абрус, посуд і прыборы, якія кветкі ставяцца да будзённага, а якія да святочнага стала, якога колеру лепш падабраць свечкі, якога стылю падсвечнікі. Памятаю, як я была ўражаная, калі ў Парыжы перад абедам нам на стол падалі вялікае кітайскае блюда з рознакаляровымі кавалачкамі сухафруктаў: бананаў, яблыкаў, фінікаў, грушаў, апельсінаў, сліваў, персікаў, вінаграду, запалілі араматныя свечкі. «*Для апетыту і прыемнасці і каб не сумна было чакаць гарачае*», – ветліва патлумачылі афіцыянты.

Разумею, што такія карцінкі не для большасці маіх суайчыннікаў, якія забыліся, калі ўжо яны хадзілі ў рэстараны ці бары. Стала значна горш жыць, людзі пачалі горш харчавацца. Нярэдка ў бацькоў няма што даць дзецям, якія ідуць ранкам у школу, няма чаго з'есці самім на сняданак. Што купляе просты чалавек у краме? Ды хіба што толькі хлеб, малако, смятану і яйкі. А за ўсім астатнім валачэцца на Камароўку, каб набыць хоць трохі танней макаронныя вырабы, садавіну і гародніну, кавалачак мяса і крупы.

Найбольш танна можна набыць прадукты ў аптавікоў на той жа Камароўцы ноччу. Вось і цягаюцца там амаль упоцемках сотні нашых суайчыннікаў – старыя, нямоглыя людзі або тыя, у каго вялікая сям'я, яны затаварваюцца, як правіла, малаякаснымі, а нярэдка – і сапсаванымі прадуктамі. Прысмакі купляюцца толькі зрэдку – на святы, альбо калі нехта ў сям'і хворы. Натуральна, што тут ужо не вядзецца нават размова пра рэжым харчавання, патрэбныя пры тым ці іншым захворванні прадукты і іх падбор. Глядзяць, каб увогуле было што з'есці.

Большасць існуе ў рэжыме, калі харчуюцца два разы ў дзень: зранку і ўвечары. А на абед у кагосьці «сабойка», сабраная з таго, што было дома – хлеб з каўбасой ці салам, а ў кагосьці – кубачак кавы ці гарбаты з булачкай, куплены у суседнім магазіне. Калі б так харчаваліся амерыканцы ці французы, яны б, напэўна, ужо пазабівалі адзін аднаго, а ў першую чаргу – кіраўніцтва краіны, якое давяло іх да такога становішчы. А нашы, відаць, маюць жалезнае здароўе і моцныя нервы.

Увогуле, «харчовая тэма» магла б стаць тэмай фільма пра наш, вельмі адметны ад усяго свету, лад жыцця, таму што, бадай, нідзе ў свеце, можа акрамя Афрыкі ды паўночнай Карэі, не харчуюцца так кепска і аднастайна, як і ў нас. І нідзе ў свеце не прыкладаецца так многа намаганняў, каб пракарміцца. Што я маю на ўвазе? А тое, што ў Беларусі ледзь ці не кожны жыве «*з зямелькі*». Вясной, летам і восенню народ шчыруе на сваіх сотках у вёсках і на лецішчах, блукае па лясах у пошуках дароў прыроды, каб зрабіць загатоўкі на доўгую зіму. Як пчолкі, цягнуць беларусы ў свае маленькія хаты-норкі капусту, бульбу, моркву, буракі, цыбулю, часнок... Жанчыны ператвараюць свае кухні ў міні-фабрыкі па сушцы, варцы, саленні, кансервацыі садавіны і гародніны. «*Інакш мы проста не выжывем*», – кажуць тыя, хто ператварыў сваё жыццё ў суцэльную прадуктовую нарыхтоўку.

ЯК МЫ СЯБЕ ПАВОДЗІМ

Разам, а можа і паралельна з «харчовай тэмай», лагічна было б здымаць фільм пра агрэсіўнасць грамадства. Бо вучоныя кажуць, што чалавек, чыё існаванне зведзена да простага фізічнага існавання, пачынае выяўляць жывёльныя інстынкты. Падказваю не толькі ідэю фільма, але і канкрэтныя сюжэты.

Пачынаць можна са здымак на прыпынку грамадскага аўтатранспарту. Камера ідзе ўніз, канцэнтруецца на асфальце, віртуозна запляваным. Пляваць сабе пад ногі – гэта вельмі спецыфічная звычка. Існуе яна ў аднаго дзікунскага і ваяўнічага плямені, што пражывае на афрыканскім кантыненце. Згодна з існуючай традыцыяй, плюнуў абарыген пад ногі супляменніку – значыць, выказвае яму сваю непавагу, хоча разабрацца з ім у адкрытай бойцы.

На прыпынку людзі не размаўляюць – тут яны не маюць прэтэнзій адзін да аднаго. Галоўная задача – апынуцца любым шляхам у транспарце.

У вось, нарэшце, цяпер можна здымаць і ў транспарце. Хаця як чыста тэхнічна рабіць здымкі ў перапоўненым аўтобусе, дзе людзей, як селядцоў у бочцы, – не ведаю. Тут можна пачуць вельмі арыгінальныя дыялогі:

– Чаго ты штурхаешся, кабыла?

– Ты мне не «тыкай», а то сапраўды зараз так штурхану, што паляціш, як фанера, з аўтобуса.

– Вось жа паскуда якая нахабная, бачыце, людзі, якія яны, маладыя, бацькоў пазабіваюць за грошы... Намалявалася, прайдзісветка...

– Баба, заткніся, а то я за сябе не адказваю, – пагрозліва папярэдзіла маладуха.

У такіх перапоўненых аўтобусах з вялікай ахвотой курсіруюць прафесійныя злодзеі. Пакуль пасажыры разбіраюцца, каму стаяць, а каму сядзець, высвятляюць адносіны, глядзіш – і абчысцілі якую разяву. Спахапіўся чалавек, а кашалька ўжо няма.

Некалькі гадоў таму мне давялося пісаць артыкул, у якім расказвалася, як адзін маладзечанскі гаспадар на тэрыторыі былога царковішча і на месцы пахавання загінуўшых пры абароне Маладзечна ад фашыстаў пасадзіў бульбу. Тэрыторыю, выдзеленую яму мясцовымі ўладамі, ён абнёс плотам, але і праз плот можна было ўбачыць па краях бульбянага поля ссунутыя каменныя помнікі. Значыць, бульбу ён садзіў проста на костках... Здзічэласць гэтага чалавека, раўнадушша да таго, што адбываецца, мясцовых уладаў і жыхароў, якія не маглі не ведаць, што ў гэтым месцы знаходзіліся могілкі, былі проста ашаламляльныя.

Чаму людзі сябе так паводзяць, чаму аказаліся занядбанымі ў нашым грамадстве спрадвечныя нормы маралі і этыкі, чаму чалавек разбурае, крышыць, псуе, пэцкае, зневажае мінулае і продкаў? Чаму мы ўвогуле так кепска жывем? Гэтае пытанне я аднойчы задала вядомай беларускай пісьменніцы Святлане Алексіевіч.

«Я ўвогуле адмаўляюся разумець людзей, якія задавальняюцца кавалкам сала з бульбай у канцы XX стагоддзя і могуць жыць у такіх умовах – сярод бруду, на руінах. Я доўга раздумвала над гэтым пытаннем. Думаю, што наша грамадства доўгія гады сілкавалася марай пра шчасце, утопія вабіла і разбэшчвала. Чакалі цуд, а ён не здарыўся. Наадварот, жыццё стала яшчэ больш жорсткім, цяжкім. Вось і злуемся на тое, што так кепска жывем, калі ўвесь свет ужо ў іншым вымярэнні. Да таго ж, перагрузкі ў сучаснага чалавека вельмі вялікія, а ён не створаны для пастаянных перагрузак».

Агрэсіўнасць людзей, што накапілася ў небяспечных дозах, хутчэй за ўсё, сведчыць пра нашу няздольнасць жыць па-новаму. Хаця, як сказала адна немка, што займаецца выдавецкімі справамі ў Мінску, немцы сталі б куды больш агрэсіўнымі і злымі, чым беларусы, калі мелі б такое жыццё. ■

СПОРТОБЗОР

Гран-при Сан-Марино

Четвертый этап чемпионата мира по автогонкам в классе Формула-1 проходил в Имоле на автодроме Энцо и Дино Феррари. Гран-при обещал быть захватывающим, ведь Михаэль Шумахер собирался исправиться перед итальянскими фанатами за неуверенное выступление на прошлогодних заездах в Сан-Марино. Опять же, хотя в Бразилии он пропустил вперед только Дэвида Култхарда, это очень не понравилось его фанам. Все ожидали реабилитации.

Квалификация началась с первых секунд. Один за другим весь пелетон, кроме самых стойких, выехал на трассу. Переждать дождик решили лишь Дэвид Култхард, Жак Вильнев и Эдди Ирвайн. Интрига квалификации сохранялась до последних минут, когда почти все гонщики выехали на свою последнюю попытку. И самым быстрым из них оказался Култхард. Вслед за ним расположился Микка Хаккинен, Ральф Шумахер, Шумахер-старший, Ярно Трулли с Рубенсом Барикелло.

И вот старт, который оказался во многом определяющим. Пробуксовка Култхарда решила исход гонки. Ральф по внутреннему радиусу обошел Дэвида и начал чеканить лучшие круги. А вот его брату повезло меньше. У Михаэля сначала спустило колесо, а потом из-за механических проблем он остановился в боксах, где и закончил свое выступление. Нешуточная борьба проходила за третью и за шестую позиции. В первом случае Барикелло обошел Микку Хаккинена благодаря верной тактике пит-стопов. За попадание же в очковую шестерку боролись сразу несколько гонщиков. Вслед за идущим на пятой позиции Мантойей шли пилоты «Джордана» Ярно Трулли и Хайнц-Харальд Френтцен. Но двигатель БМВ не выдержал и задымил. Хуану Пабло Мантойи пришлось остановиться. Ральф Шумахер уверенно шел к первой в своей карьере победе.

Нужно отметить, что крупных аварий в этом Гран-при не было. Из десяти пилотов, которые не доехали, только два гонщика побывали в заграждении. После двух пит-стопов лидирующая тройка не претерпела изменений. Вот только Микка Хаккинен стал приближаться к представителю итальянской конюшни «Феррари» Рубенсу Барикелло. Но было уже поздно. В закрытом парке Ральфа ждал его брат, который первым и поздравил его с победой. На лице Фрэнка Уильямса блестели слезы, ведь его команда за последние три года первый раз была на вершине пьедестала.

Теперь в чемпионате двоевластие: у Михаэля и у Култхарда по двадцать шесть очков. На третьей позиции находится Рубенс Барикелло, которого преследует Ральф Шумахер. Тем интересней будут и последующие гонки. В Испании состоится следующий Гран-при, на котором победит сильнейший.

Впереди все те же

Позади уже два тура одиннадцатого чемпионата Беларуси по футболу, а значит, уже можно сделать определенные выводы. И главный из них – лидеры у нас прежние. Речь, конечно же, идет о золотом и серебряном призерах прошлогоднего чемпионата: мозырской «Славии» и борисовском «БАТЭ».

Наибольший интерес вызывала игра чемпиона, претерпевшего в межсезонье кардинальные изменения в составе. С точки зрения результата, поклонникам «Славии» пока жаловаться не на что. Две победы и десять безответных мячей в ворота соперников могут только радовать. Что касается игры, то здесь сложно говорить о чем-то конкретном, ведь мозыряне играли с «Молодечно-2000» и витебским «Локомотивом» – наиболее явными претендентами на вылет. Истинную силу чемпиона покажет кубковый четвертьфинал с «БАТЭ».

Что касается непосредственно БАТЭ, то игра борисовчан оставила гораздо более цельное впечатление. Все-таки их соперниками были «Гомель» и брестское «Динамо», причем с первыми они играли в гостях. Эти игры показали, что футболисты «БАТЭ» не только уже сейчас находятся в хорошей форме, но имеют реальные возможности для усиления игры по ходу сезона.

Судя по всему, сумеет составить им конкуренцию в борьбе за золото бобруйская «Белшина». Вячеслав Акшаев сумел в межсезонье значительно укрепить состав, что позволяет ему варьировать тактику игры в зависимости от соперника. Учитывая окрепшее материальное положение бобруйчан, можно смело причислить их к фаворитам сезона, что они и доказали первыми играми.

Судя по всему, как и предполагалось перед началом сезона, главными его неудачниками могут стать «Молодечно-2000» и «Локомотив-96». Клубы имеют очевидные проблемы с составом и подготовкой к сезону. Но не это главное. Хуже всего то, что уже много лет эти команды фактически предоставлены сами себе. Отсюда постоянные финансовые трудности, неуверенность в будущем, что отрицательно сказывается на выступлении команд. Хотя, зная возможности и везучесть Людаса Румбутиса, не стоит полностью сбрасывать со счетов «Молодечно», что команда и доказала в последней игре.

Пока блеклое впечатление оставляет игра команд, претендовавших в прошлом сезоне на высокие места. Ни минское «Динамо», ни «Шахтер», ни «Неман-Белкард», ни «Гомель» пока не подтверждают своей игрой притязания на высокие места в турнирной таблице.

Вновь «Манчестер»

Вопрос о футбольном чемпионе Англии уже давно не представлял ни для кого интереса, так как шансов догнать «Манчестер Юнайтед» ни у кого не было. Разве что теоретически. Поэтому основное внимание было сосредоточено на борьбе за серебро и бронзу.

Наконец в минувшем туре произошло юридическое оформление очередного чемпионства манкунианцев. Поводом для этого стала не столько победа «Манчестера» над «Ковентри» 4:2, но и поражение его главного соперника – «Арсенала». Осечка «канониров» в домашнем поединке с «Мидлсборо» (0:3) позволила «Манчестер Юнайтед» официально оформить свой четырнадцатый чемпионский титул.

Подготовил СЕРГЕЙ ВИТАЛЬЕВ

ЛІСТ У НУМАР

Ці ведаюць суддзі, што такое Закон?

Прайшоў ужо год, як законапаслухмянага грамадзяніна ў мароз, зімой, пазбавілі ягонай кватэры і, фактычна, усёй маёмасці. Кандыдат навук, непʼючы, з крыміналам не звязаны, бізнэсам не займаецца, лідэрам палітычнай апазіцыі не зʼяўляецца – вось такі сціплы партрэт чарговага пакутніка і ахвяры нашай супрацьчалавечай дзяржаўнай машыны.

Суддзя Першамайскага раёна горада Мінска Таццяна Лукʼянчык вынесла *«решение»*, пасля чаго грамадзянін апынуўся ў такой гаротнай сітуацыі. На думку гэтага чалавека, *«решение»* ёсць цалкам незаконнае, таму ён звярнуўся ў наглядныя інстанцыі. З дапамогай высокакваліфікаваных юрыстаў складаліся шматлікія скаргі ў Мінскі гарадскі суд, у Вярхоўны суд. Але справа так і не вырашалася, а наадварот службовыя асобы парушалі чарговыя нормы законаў. Калі ў скарзе звяртаецца ўвага наглядных органаў на парушэнне 12-ці нормаў грамадзянскага, працэсуальнага кодэкса і іншых законаў, то на гэта не зважаюць суддзі Мінскага гарадскога і Вярхоўнага судоў. Гэтыя парушэння яны проста імгненна забываюць, больш таго, у сваіх адказах яны практычна не ўзгадваюць нормы законаў, а наадварот, як звычайная кухарка, разважаюць аб бытавой сітуацыі. Складваецца ўражанне, што суддзі ўвогуле не ведаюць пра існаванне працэсуальнага кодэкса, Канстытуцыі РБ.

Так, напрыклад, у артыкле 428 гэтага кодэкса запісана: «*Установив, что допущенные судом первой инстанции нарушения норм права не являются основанием к отмене решения, суд кассационной инстанции должен указать на них в кассационном определении или в специально вынесенном частном определении*». Але нават і таго не робіцца. Таму ўсё гэта як размова з глухім. А народная прымаўка тут больш да месца: што кідаць гарох аб сценку. Гарох – законы, словы адскокваюць ад гэтай мёртвай, каменнай сістэмы, якую больш дакладна называюць *правапахавальнай* сістэмай, а не судовай сістэмай абароны правоў і свабод чалавека. Дарэчы, неяк на семінары, якія арганізавалі англійскія юрысты, высокі начальнік з міністэрства юстыцыі вымушаны быў засведчыць: «*Зачастую наши правоприменительные органы слабо осведомлены о правах человека*».

З другога боку, работнік канцылярыі сакратарыята Вярхоўнага суда РБ сказала: «*Не ходите, не пишите – всё равно вы тут ничего не добьётесь*». А пакуль суддзі карыстаюцца такім законам: «*Закон – гэта я, суддзя*». Таму яны вельмі хутка (але не маюць права на гэта) тлумачаць законы. Як гэта, напрыклад, зрабіў намеснік старшыні Вярхоўнага суда РБ І. А. Міранічэнка адносна карыстання беларуса беларускай, дзяржаўнай, мовай у судах. Бач ты, карыстанне дзяржаўнай мовай патрабуе яшчэ і хадатайніцтва аб гэтым карыстанні. Ён нават забыўся, што карыстанне мовай зʼяўляецца канстытуцыйнай нормай, і перашкода ў гэтым цягне крымінальную адказнасць.

Суддзі доўга не думаюць над законамі, а самі ствараюць новыя, «*прыхватызуя*» выключнае права парламента. Так, напрыклад, згаданая вышэй суддзя Лукʼянчык стварыла закон аб долях, частках жылля, якія належаць кожнаму чалавеку, які жыве ў кватэры.

Суддзі самастойна, без згоды грамадзяніна, які падае іск, мяняюць адказчыка па іску. Напрыклад, суддзя Есман (суд Цэнтральнага раёна Мінска), самастойна змяніў іск, быў ён да пракурора Мінска Мікалая Купрыянава, а суддзя правёў працэс па іску да пракуратуры Мінска, установы.

Апафеозам гэтага цемрашальства ёсць, канешне, тлумачэнне суддзямі не законаў, а вядомых рускіх слоў. Напрыклад, старшыня Мінскага гарадскога суда М. М. Аруяка лічыць, што сцвярджэнне аб розным сэнсе слоў «*переселить*» і «*выселить*» – гэта «*несостоятельно*». Вось так, грамадзяне! Такім чынам *правапахавальнасць* суддзяў закранула нават рускую мову. Сучасная дзяржаўная сістэма, якая, фактычна, працуе супраць грамадзян, сваёй структурай яскрава сведчыць: законы нашай дзяржавы не для абароны правоў чалавека, не для дапамогі грамадзяніну ў рэалізацыі ягоных законных правоў і інтэрэсаў.

На гэтым узгаданым прыкладзе відавочна, што калі суддзя раённага суда груба парушыў закон, то судовая сістэма абараняе яго, а не грамадзяніна. Нават абсалютныя, засведчаныя работнікамі гэтай сістэмы, факты не бяруцца пад увагу. Напрыклад, акт судовага выканаўцы сведчыць: «*В. І. Грицук выселен*». Іншымі словамі, яго выкінулі з яго кватэры на вуліцу, вось так проста. Але гэтага простага сэнсу ў Мінскім гарадскім судзе зразумець не здольныя ці не хочуць. У Вярхоўным судзе скаргу не жадаюць нават разглядаць, яна ляжыць ужо амаль 4 месяцы, а па закону праз 1–2 месяцы грамадзяніну неабходна даць адказ. У суддзяў Вярхоўнага суда, дакладней яго кіраўніцтва, засталася толькі адна магчымасць перамагчы грамадзяніна і закон – не даваць адказу. Як кажуць рускія людзі, «*на нет и суда нет*».

Сапраўды, як прыцягнуць да адказнасці потым гэтых парушальнікаў канстытуцыі і заканадаўства, калі не будзе дакумента з іх подпісам. А што прыйдзе час справядлівага суда, я перакананы, зусім нядоўга чакаць нам усім. Хай трымцяць сёняшнія ўладары. Канешне, зараз «*ворон ворону глаз не выклюет*». Бо калі, адпаведна закону «Аб зваротах грамадзян», у суд Ленінскага раёна Мінска была накіравана скарга на В. А. Сукала, старшыню Вярхоўнага суда, адтуль яе паспяхова адфутбалілі – трэба разумець, што той, хто гэта зрабіў, сцвярджае: для старшыні Вярхоўнага суда законы не існуюць.

Вось так, у Беларусі у XXI стагодзі зноў ёсць «господа» і ёсць «холопы»... Дык што ж нам пакідаюць? Сякеры? Але ў гэтым годзе ёсць і іншы шлях скінуць гнілую галаву.

ВАЛЕРЫЙ ГРЫЦУК, МІНСК

Адміністратыўны рэсурс у дзеянні

Аналітыкі сцвярджаюць, што выбары ў гэтак званы парламент – ёсць рэпетыцыя напярэдадні прэзідэнцкіх. Глянем на выбары ў Віцебску менавіта з гэтага боку. Балатавацца па чатырох акругах пажадалі 27 чалавек, прайшлі рэгістрацыю 20. Кандыдаты ад улады вылучаліся ад працоўных калектываў. Каб выбары адбыліся, зроблена шмат.

Са спіскаў выбаршчыкаў выкрэслілі 9 тысячаў чалавек (з 240 тысячаў). Праведзена чыстка камісіяў: у іх склад уведзены новыя людзі, зроблена замена старшыняў і намеснікаў ва ўсіх участковых камісіях за тое, што яны не забяспечылі неабходную колькасць выбаршчыкаў. Са старшынямі камісіяў праведзены рознага кшталту нарады. Да іх ведама даведзены план па колькасці прагаласаваўшых – не меней 60 %.

За першыя чатыры дні прагаласавала каля 17 тысячаў чалавек. Значная колькасць выбаршчыкаў павінна была прагаласаваць на даму праз перанасныя урны. Дзеля гэтага былі складзены спісы ўсіх пенсіянераў, якіх камісіі абавязаны былі абысці і заклікаць прагаласаваць. Ва ўсіх школах горада прайшлі бацькоўскія сходы, на якія бацькоў прасілі прыйсці з пашпартамі, каб прагаласаваць датэрмінова. У кожнай школе прысутнічалі адказныя асобы ад вертыкалі. У многіх арганізацыях ды прадпрыемствах прымушалі работнікаў галасаваць у час работы, напрыклад выхавацеляў дзіцячых садкоў, такое ж адбывалася на заводзе «Маналіт», «Эвістар» і г. д.

Яшчэ адзін сродак уплыву на выбаршчыкаў – пражыванне ў інтэрнатах, а іх у Віцебску 101. Там жыве 28 тысяч чалавек. Студэнтаў педагагічнага універсітэта, тэхналагічнага універсітэта, ветэрынарнай акадэміі ды медыцынскага універсітэта адміністрацыя ВНУ абавязала галасаваць датэрмінова. У кастрычніку 90% пражываючых у інтэрнаце «*выканалі свой грамадзянскі абавязак*», прыкладна столькі ж пайшло на ўчастак і зараз.

Разгорнута беспрэцэдэнтная кампанія ў дзяржаўных мас-медыя. Далі права выступаць па тэлевізіі нават прадстаўнікам ад апазіцыйнай БСДП. Улёткі з праграмамі можна было ўбачыць у многіх крамах. Гэтыя ды іншыя меры прыняты невыпадкова. Як стала вядома з неафіцыйных крыніцаў, тым вертыкальшчыкам, якія не забяспечаць неабходны «працэнт», пагражае звальненне. І трэба зазначыць, што ўлады дзейнічалі вельмі жорстка. Вось што распавявала сябра выбарчай камісіі, якая прасіла не называць яе імя.

«*На ўчастку пражывае 2500 выбаршчыкаў. У параўнанні з мінулымі выбарамі іх колькасць скарочана на 500 чалавек. Падчас датэрміновага галасавання сваю волю выказалі каля 600 чалавек, што складае болей 30%. Падчас абыходу кватэр сабралі яшчэ каля 200 галасоў. 1200 выбаршчыкаў прыйшло 18 сакавіка. А якія лічбы зʼявяцца ў выканкаме, не ведаюць нават сябры камісіяў, бо гэта таямніца за многімі пячаткамі. Пытанне для вертыкалі стаяла жорсткае: або працэнты, або пасада*».

